


*Пераможца Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Ліцэра»*

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

# ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1986 года

Выходзіць адзін раз на месяц

№ 2 (492)

19 лютага 2020 года

Распаўсюджваецца бясплатна




1940 2020





***Дарагія Купалаўцы!***
***Ад шчырага сэрца віншую Вас са значнай падзеяй у жыцці Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы – 80-годдзем з дня заснавання!***

*80 гадоў – слаўная дата, якая з'яўляецца пераканаўчым доказам значнасці Універсітэта.*
*За гэтай лічбай – доўгі, часамі няпросты, насычаны ўнікальнымі справамі шлях станаўлення і развіцця. Мы ганарымся яркімі старонкамі летапісу Універсітэта, імёнамі тых, хто стаяў ля вытокаў яго стварэння, хто забяспечвае яго аўтарытэт і запатрабаванасць сёння.*
*Азіраючыся назад, можна з упэўненасцю адзначыць, што ўсе 80 гадоў у гісторыі ГрДУ імя Янкі Купалы былі часам мэтанакіраванага руху наперад.*
*Прыемна ўсведамляць, што свой дзень нараджэння Купалаўскі ўніверсітэт сустракае, дэманструючы адпаведнасць не толькі выклікам сённяшняга дня, але і маючы вялікі творчы і прафесійны патэнцыял, добры зачын для новых поспехаў і плённых пачынанняў.*
*Наш Універсітэт малады душой!*
*Абапіраючыся на багатыя традыцыі класічнай адукацыі, назапашаны вопыт, мы з упэўненасцю глядзім у будучыню, адкрыты для новых ідэй і дасягненняў.*
*Пераканана, патэнцыял развіцця Універсітэта – у згуртаванай адзінымі мэтамі Купалаўскай сям'і, плённай працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў, ініцыятывах студэнтаў, поспехах выпускнікоў і ветэранаў.*
*Прыміце, калі ласка, шчырыя словы падзякі за ваш асабісты ўнёсак у росквіт Alma mater, неабыякавасць да лёсу роднага Універсітэта!*
*Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Янкі Купалы жадаю творчай атмасферы, стабільнасці і росквіту!*
*Усім прадстаўнікам Купалаўскай сям'і – любові да сваёй справы, новых смелых ідэй, яркіх здзяйсненняў, кахання і дабрабыту!*
*І няхай у дасягненні сумесных поспехаў нам дапаможа сапраўдная карпаратыўная супольнасць, калі Купалаўцы разам будуць імкнуцца да новых вяршыняў!*

*Са святам, дарагія Купалаўцы!*
*З юбілеем, родны Універсітэт!*

***З вялікай павагай,***
***Рэктар універсітэта Ірына Кітурка***

## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ


**АФІЦЫЙНА**

**Сіла ў адзінстве**

Першы ў краіне З'езд выпускнікоў, прымеркаваны да 80-годдзя з дня заснавання ўніверсітэта, адбыўся ў ГрДУ імя Янкі Купалы.

Стар. 2-3

**ГІСТОРЫЮ ПІШАМ РАЗАМ!**

**З "джалам" вайны**

Успамінамі пра пісьменніка Аляксея Карпюка, аднаго з першых выпускнікоў Гродзенскага педінстытута, дзеліцца яго малодшая дачка Валянціна.

Стар. 6-7

**ЮБІЛЕЙ**

**Мужнасць. Адвага. Доблесць.**

Ваеннаму факультэту - 15 год. Інтэрв'ю з адзінай жанчынай у калектыве выкладчыкаў факультэта Аленай Банцюковай.

Стар. 10

АФІЦЫЙНА

# Сіла ў адзінстве

**Першы ў краіне З'езд выпускнікоў, прымеркаваны да 80-годдзя з дня заснавання ўніверсітэта, адбыўся ў ГрДУ імя Янкі Купалы. Святочнае мерапрыемства, якое прайшло 15 лютага, аб'яднала выпускнікоў розных пакаленняў, розных прафесій з розных куткоў Беларусі. Для ўсіх іх пачатковай кропкай адліку жыццёвых і прафесійных поспехаў стала Купалаўская сям'я.**






У працы З'езда прынялі ўдзел 125 дэлегатаў, прадстаўнікі ўсіх факультэтаў універсітэта, якія сёння з'яўляюцца прафесійнымі і грамадскімі дзеячамі і працуюць на карысць Гродзенскай вобласці і краіны. За 80 год гісторыі Купалаўскі ўніверсітэт і яго выпускнікі зрабілі важкі ўнёсак у развіццё Рэспублікі Беларусь, а сам юбілей, як важная падзея ў развіцці айчыннай адукацыі, мае значную грамадскую вартасць.

У прывітальным слове да ўдзельнікаў З'езда выпускнікоў рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Кітурка адзначыла:

*– Самае вялікае дасягненне ўніверсітэта – гэта поспехі яго выпускнікоў, таму што ўніверсітэт па сутнасці існуе дзеля таго, каб выяўляць, раскрываць і рэалізоўваць патэнцыял тых студэнтаў, якія ў ім вучацца. Юбілей універсітэта – наша агульнае свята, свята многіх пакаленняў нашых супрацоўнікаў, студэнтаў і выпускнікоў. Дзякуй вам за тое, што вы, пакінуўшы свае важныя справы, пераадолеўшы адлегласць, прыехалі сюды і дапамаглі нам рэалізаваць нашу мару – правесці першы ў краіне З'езд выпускнікоў. Тут, у роднай alma mater, вы атрымалі веды, неабходныя прафесійныя кампетэнцыі, знайшлі сяброў, а некаторыя, магчыма, стварылі сем'і. Мне вельмі хочацца, каб сёння вы адчувалі сябе так, быццам прыехалі дамоў.*

Ірына Фёдараўна ў сваім дакладзе расказала аб асноўных гістарычных вехах станаўлення і развіцця, традыцыях, дасягненнях, канкурэнтных перавагах і сучасным стане ўніверсітэта, а таксама яго перспектыўных напрамках.

Ад дэлегатаў З'езду выступіў намеснік старшыні Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта, выпускнік факультэта эканомікі і кіравання ГрДУ імя Янкі Купалы 2002 года Андрэй Болтрык. Ён павіншаваў калектыў універсітэта, выказаў падзяку ўсім выкладчыкам, якія прымаюць удзел у падрыхтоўцы кадраў для рэгіёна і краіны. Выступіла таксама і начальнік аддзела агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі Галоўнага ўпраўлення Гродзенскага аблвыканкама, выпускніца факультэта педагогікі і псіхалогіі 2000 года Святлана Кавалеўская, якая адзначыла, што Галоўнае ўпраўленне адукацыі аблвыканкама і Купалаўскі ўніверсітэт – гэта адзіны непадзельны арганізм, які вырашае надзённыя задачы, што стаяць перад нацыянальнай сістэмай адукацыі. Першая з галоўных задач – падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў па ўсіх педагагічных спецыяльнасцях, запатрабаваных у Гродзенскім рэгіёне:

*– Сёння лепшыя устаноўы адукацыі вобласці прадстаўляюць магчымасць прайсці студэнтам практыку, лепшыя педагогі вобласці з'яўляюцца навуковымі рэцэнзентамі дыпломных, магістарскіх прац, выступаюць у якасці членаў дзяржаўных экзаменацыйных камісій. Мы праводзім у цеснай сувязі з універсітэтам паспяховую працу з высокаматываванымі і таленавітымі вучнямі і студэнтамі, а таксама шэраг прафарыентацыйных мерапрыемстваў.*

Падчас працы З'езду выступіў пракурор г. Гродна, выпускнік юрыдычнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы 1995 года Уладзімір Клішын, які адзначыў, што 90% пракурорскіх работнікаў з'яўляюцца выпускнікамі Купалаўскага ўніверсітэта. Студэнты юрыдычнага факультэта праходзяць вучэбныя і азнаямляльныя практыкі ў пракуратуры, дзе яны паглыбляюць свае тэарэтычныя веды. Работнікі пракуратуры займаюцца выкладчыцкай дзейнасцю, у сценах юрыдычнага факультэта дзейнічае зала судовых пасяджэнняў, на базе пракуратуры г. Гродна функцыянуе філіял кафедры крымінальнага права, крымінальнага працэсу і крыміналістыкі.

*– Дзякуючы цеснай сувязі з юрыдычным факультэтам Купалаўскага ўніверсітэта, у пракуратуры адсутнічае кадравы голад,* – падкрэсліў Уладзімір Клішын.

Неабходна адзначыць, што Асацыяцыя выпускнікоў ГрДУ імя Янкі Купалы існуе з 1997 года. За гэты час ажыццявіўся шэраг праектаў, накіраваных на ўдасканаленне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін эканомікі і сацыяльнай сферы.

Як зазначыла рэктар універсітэта Ірына Кітурка, такія з'езды выпускнікоў плануецца праводзіць не радзей, чым адзін раз на пяць гадоў, а ўсе надзённыя пытанні развіцця супрацоўніцтва будуць вырашацца па меры іх узнікнення пры дапамозе Савета Асацыяцыі выпускнікоў.

У ходзе працы З'езда быў выбраны новы старшыня Асацыяцыі выпускнікоў, прэзідыум, а таксама склад рэвізійнай камісіі. Старшынёй Асацыяцыі выпускнікоў стаў дырэктар Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А.Д. Сахарава, выпускнік фізіка-матэматычнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы Сяргей Маскевіч.

Згодна з Дарожнай картай развіцця Асацыяцыі ўдзельнікі абмеркавалі шэраг мерапрыемстваў. У межах іх рэалізацыі чакаецца правядзенне сумесных майстар-класаў, семінараў, канцэртаў, фестываляў і турыстычных злётаў. Акрамя таго, запланавана распрацоўка праграмы пасляўніверсітэцкага суправаджэння, а таксама збор успамінаў выпускнікоў розных гадоў.

Мерапрыемства завяршылася канцэртам і сумесным фота на памяць.

**Таццяна СУШКО.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА і Кацярыны СЯРЖАНТАВАЙ**



# Купалаўскі ўніверсітэт у маім жыцці



**Сяргей Маскевіч, дырэктар Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А.Д. Сахарава, выпускнік фізіка-матэматычнага факультэта 1974 года:**

– З Купалаўскім універсітэтам я ніколі не расставаўся. Тут у мяне ёсць вучні, навуковыя лабараторыі, дзе вядуцца сумесныя навуковыя праекты. Можа, не так часта я ў ім бываю фізічна, але ў віртуальнай прасторы знаходжуся на сувязі пастаянна. Мяне не пакідае адчуванне, што Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы трошкі нават апераджае час. Магу сказаць так: калі хочаш ведаць, якія тэндэнцыі ў адукацыі і навуцы будуць актуальнымі заўтра, паглядзі, якія новыя ідэі і праекты рэалізуюцца ў Купалаўскім універсітэце сёння.



**Андрэй Кароль, рэктар БДУ, выпускнік інжынернага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы 1995 года:**

– ГрДУ імя Янкі Купалы – гэта мой родны ўніверсітэт, які для мяне вельмі многа значыць. Я ўдзячны лёсу за магчымасць разам з калектывам у свой час сфарміраваць стратэгію ўніверсітэта і вызначыць тактыку яе рэалізацыі. Мне прыемна, што закладзеныя ў тыя гады традыцыі прадаўжаюцца і сёння.



**Андрэй Болтрык, намеснік старшыні Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта, выпускнік факультэта эканомікі і кіравання ГрДУ імя Янкі Купалы 2002 года:**

– 23 гады таму я ўпершыню пераступіў парог Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Склалася так, што ўсё маё жыццё так ці інакш было звязана з універсітэтам. Тут я атрымаў вышэйшую адукацыю, тут было маё першае месца працы, літаральна паўтары гады таму абараніў магістарскую дысертацыю. Я вельмі ўдзячны ўніверсітэту і свайму роднаму факультэту эканомікі і кіравання, усім маім выкладчыкам, якія дапамаглі мне знайсці сваё месца ў жыцці. Удзячны Генадзю Аляксеевічу Гачко, які быў строгім, патрабавальным і заўсёды справядлівым дэканам фізіка-тэхнічнага факультэта, дзе я атрымаў першую адукацыю, Марыне Яўгеньеўне Карпіцкай, якая пераканала мяне, што нават у сталым узросце мае сэнс прадоўжыць навучанне і атрымаць новыя веды.



**Павел Сухарукаў, дырэктар – галоўны рэдактар Выдавецкага дома "Звязда", выпускнік ГрДУ імя Янкі Купалы 1996 года:**

– Ужо амаль трыццаць гадоў прайшло, як я скончыў універсітэт. Гэта былі самыя шчаслівыя гады майго жыцця, тым больш падчас вучобы на гістарычным факультэце я сустрэў сваю палавінку, мы закахаліся адзін у аднаго, ажаніліся і ўжо амаль 25 гадоў разам. Заўсёды з вялікім задавальненнем наведваю альма-матэр і кожны раз заўважаю змены ў лепшы бок. Адчуваю гонар за наш універсітэт.



**Тамара Карэнка, выпускніца матэматычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага педінстытута 1956 года:**

– Хоць прайшло ўжо шмат гадоў, але я з вялікім задавальненнем успамінаю свае студэнцкія гады і з вялікай удзячнасцю – усіх выкладчыкаў. Трапіць вучыцца ў храм навукі ў тыя гады для многіх было недасягальна. Я нарадзілася ў вёсцы, дзе нават сярэдняя школа знаходзілася за 18 км ад дома, нават марыць пра вучобу ў інстытуце было страшна. Бацькі надта перажывалі, што не змогуць мне дапамагчы і мне прыйдзецца жыць на адну стыпендыю. Але было такое вялікае жаданне вучыцца! Зараз амаль напрыканцы жыцця я апынулася зноў тут – у месцы маёй маладосці, дзе ўсё такое роднае, і я вельмі ўдзячна за запрашэнне. Гэта для мяне вельмі каштоўна.



**Уладзімір Клішын, пракурор г. Гродна, выпускнік юрыдычнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы 1995 года:**

– Я хачу выказаць падзяку свайму роднаму юрыдычнаму факультэту за атрыманыя веды. Менавіта веды прыводзяць да поспеху ў практычнай прафесійнай сферы дзейнасці.




# От юбилея к юбилею

## Цифры 2015-2020 Факты

**257**
молодых специалистов принято на работу

**121**
международный договор

**21 494**
выпускников I и II ступеней высшего образования и колледжей

**78**
иностранных делегаций

**151**
Приглашенный профессор

**80**
диссертаций

**72**
кандидатских

**8**
докторских

**200**
статей в высокорейтинговых изданиях Scopus, Web of Science

**62**
ученых звания

**325**
медалей на соревнованиях международного уровня

**22**
англоязычные программы

Университет года 2018



Республиканская доска почета «Научная организация» 2019






Площадь университетского флага 2015



Визит Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко 19 октября 2018 года



Турнир по волейболу на Кубок ректора 2015



Республиканский гражданско-патриотический марафон «Вместе за сильную и процветающую Беларусь» 2015




Научно-технологический парк 2017



Новое общежитие 2020

ТРАДЫЦЫІ

# Тут гадуюцца дынастыі

**Праца ў асяроддзі людзей высокаадукаваных, інтэлігентных, захопленых навукай і адданых педагагічнай справе, месцам канцэнтрацыі якіх з'яўляецца Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, фарміруе маральныя каштоўнасці і прафесійныя якасці цэлых дынастый. 80 год Купалаўскаму ўніверсітэту і 80 год, аддадзеных на яго карысць сям'ёй Марозавых.**

Напрацягу амаль 58 гадоў жыццё ўніверсітэта, яго гісторыя разгортваецца на вачах Святланы Марозавай, а з 1972 года – і з яе непасрэдным удзелам.

Яе бацька, родапачынальнік навуковай дынастыі Купалаўцаў – філолаг Валянцін Іванавіч Марозаў – у Гродзенскі педагагічны інстытут размеркаваўся ў 1962 годзе пасля заканчэння аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1972 годзе Валянцін Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю "Асаблівасці мовы твораў Францішка Багушэвіча" і за дваццаць гадоў працы прайшоў шлях ад асістэнта, выкладчыка да загадчыка кафедры беларускай мовы і дэкана філалагічнага факультэта.



Валянцін Іванавіч Марозаў

*– Спачатку наша сям'я жыла ў інтэрнаце на вуліцы Сацыялістычнай,* – дзеліцца ўспамінамі Святлана Марозава, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін. *– На першых паверхах інтэрната сялілі да атрымання кватэр новапрыбылых на працу па размеркаванні або па запрашэнні выкладчыкаў, на трэцім – студэнтаў-філолагаў. За першы год я пазнаёмілася з усімі бацькавымі калегамі-суседзямі. Сярод іх быў і кампазітар Антон Валынчык, у гонар якога сёння на будынку вучэбнага корпуса факультэта мастацтваў і дызайну размешчана мемарыяльная шыльда.*

З гэтага часу Святлана і акунулася ў атмасферу інстытуцкага жыцця. Паводле яе ўспамінаў, бацька сябраваў з Адамам Мальдзісам і Уладзімірам Караткевічам. Пасля абароны бацькам кандыдацкай дысертацыі яны прыехалі ў госці. Адам Мальдзіс падарыў бацьку кніжку, у якой Уладзімір Караткевіч напісаў вершаваныя радкі:

*За мову Багушэвіча –*
*Падзяка Караткевіча.*
*Не церніі, а розы*
*Мы дорым В. Марозаву.*

А затым, не адрываючы рукі, намаляваў шарж – партрэт свой і Адама Мальдзіса. Кніжка з іх аўтографамі і сёння захоўваецца ў хатняй бібліятэцы.

Святлана Валянцінаўна ўспамінае, што інстытут у 60–70-я гады быў невялікі. У ім працавала няшмат выкладчыкаў, таму ўсе адзін другога ведалі; студэнты вучыліся ў корпусе – будынку былой Марыінскай гімназіі. Уваход быў праз двухстворкавыя дзверы з казырком на каваных металічных кранштэйнах. Адкрыццё галоўнага корпуса, які дабудавалі ў 1967 годзе, стала вялікай гарадской падзеяй. Культурнае жыццё інстытута было вельмі насычаным: агульнаінстытуцкія вечары з нагоды розных святаў, юбілейныя, спартыўныя – з урачыстым пасяджэннем, канцэртам і абавязкова студэнцкай дыскатэкай. Двойчы на год Святлана з бацькам прымалі ўдзел у дэманстрацыях. Асабліва дзяўчыне запомніліся першамайскія, з сонцам, цяплом, першымі зялёнымі лісточкамі на дрэвах.

У 1972 годзе Святлана Марозава паступіла на гістарычны факультэт Гродзенскага педінстытута. Спачатку хацела ісці на філалагічны, але маці, таксама філолаг, адгаварыла, маўляў, хопіць нам у сям'і двух філолагаў.



Святлана Валянцінаўна Марозава

*– Маімі выкладчыкамі былі прафесары Барыс Фіх, Якаў Мараш, Міхаіл Жарскі, Сяргей Габрусевіч, Іван Крэнь, Іван Коўкель, Фелікс Налівайка, Уладзімір Міхнюк... яны сталі легендамі гістарычнага факультэта. Некаторыя з іх, а таксама прафесары Міхаіл Ткачоў, Барыс Клейн потым сталі маімі старэйшымі калегамі. А з Сяргеем Габрусевічам мы нават напісалі і ў 2005 годзе выдалі кнігу пад назвай "Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё. Спадчына".*

Шлях у навуку і адпаведна ў выкладчыцкую дзейнасць пачаўся для Святланы Валянцінаўны са студэнцкага краязнаўчага навукова-даследчага гуртка "НіКа", які ў 1955 годзе заснаваў прафесар Якаў Навумавіч Мараш. Гурток і сёння існуе пры кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін. Многіх сваіх выпускнікоў ён пусціў у вялікую навуку. Гэта адзіны ў нашай краіне студэнцкі гуртох з 65-гадовай гісторыяй. У 2007 годзе за сваю плённую дзейнасць ён быў узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

*– Дзякуючы ўніверсітэту, гісторыя для мяне спалучылася ў адзінае і як вучэбная дысцыпліна, і як навука, і як хобі. А гэта і ёсць прафесійнае шчасце. Яно ж – важны складнік жыццёвага шчасця наогул.*

Трэцяе пакаленне ўніверсітэцкіх выкладчыкаў з дынастыі Марозавых у асобе Сяргея Паўлавіча, дацэнта кафедры журналістыкі, аказалася пакаленнем творчым і living рознабаковым. З маленства мама, Святлана Марозава, брала Сяргея на работу ва ўніверсітэт, на святочныя мерапрыемствы. Такім чынам ён плаўна і натуральна ўвайшоў у жыццё купалаўцаў. Нягледзячы на тое, што ўнук знакамітага філолага асабіста не быў знаёмы са сваім дзядулям, але яго ўплыў быў таксама вельмі адчувальны пры выбары жыццёвага шляху:

*– Я чуў добрыя словы ў адрас дзеда ад людзей, якія асабіста яго ведалі. Таму, як мінімум, была адказнасць, не хацелася падвесці і сапсаваць яго добрае імя.*

Сяргей расказаў, што на момант выбару яго месца ў свеце і альтэрнатывы не было, акрамя гістарычнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы. Хаця, прызнаўся, спачатку ўпіраўся, было жаданне, напэўна, як і ва ўсіх падлеткаў, з'ехаць ад бацькоў як мага далей.



Сяргей Паўлавіч Марозаў

Пазней, па словах Сяргея Марозава, было прыкладзена шмат намаганняў, каб не застацца на ўсё жыццё сынам вядомай Марозавай. Хацелася мець сваё аўтарытэтнае імя. Захапленне фатаграфіяй, якое з цягам часу з хобі перарасло ў нешта большае – прафесію, стыль жыцця, тое, што прыносіць асалоду, і стала яго індывідуальнай адметнасцю. І калі напрыканцы аспірантуры Сяргею прапанавалі на кафедры журналістыкі выкладаць фотадысцыпліны, ён з радасцю пагадзіўся:

*– Праца на пасадзе выкладчыка ўніверсітэта мне заўсёды падабалася. Я назіраў за мамай і бачыў, што яна заўсёды маладая душой, разбіраецца ва ўсіх маладзевых трэндах і ў любым узросце разумела мяне. Напэўна, праца з моладдзю не дазваляе закасцянець. А па-сапраўднаму адчуў сябе прадаўжальнікам родавай прафесіі, калі абараніў кандыдацкую дысертацыю.*

Прафесар гісторыі Святлана Марозава звязала першае і трэцяе пакаленне выкладчыкаў Марозавых, якім лёсам не дадзена было сустрэцца. Але нягледзячы на тое, усе тры пакаленні злучыліся ў адзінае цэлае дзякуючы імкненню да ведаў, гуманітарнай сферы, даследчай дзейнасці, працы на карысць роднай Беларусі і Купалаўскаму ўніверсітэту.

**Таццяна СУШКО.**
**Фота з асабістага архіва МАРОЗАВЫХ**




Кніга, атрыманая ў падарунак Валянцінам Марозавым ад У. Караткевіча і А. Мальдзіса, 1973 год



# З "джалам" вайны: гісторыя знакамітага Купалаўца

**Ад пачатку свайго існавання Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы падрыхтаваў каля ста тысяч прафесіяналаў, якімі заўсёды мог ганарыцца. Іван Ціхан, Вольга Корбут, Данута Бічэль-Загнетава… – імёны Купалаўцаў, якія вядомы не толькі ў нашай краіне, але і ў свеце. У ліку першых выпускнікоў быў і адзін з самых знакамітых гродзенскіх пісьменнікаў Аляксей Карпюк. Напярэдадні 80-годдзя з дня заснавання Купалаўскага ўніверсітэта ўспамінамі пра Аляксея Нічыпаравіча падзялілася з чытачамі газеты "Гродзенскі ўніверсітэт" яго малодшая дачка Валянціна.**

З-пад пяра Аляксея Карпюка, якому ў гэтым годзе 14 красавіка споўніцца сто гадоў, выйшлі аповесці і апавяданні "Дзве сасны", "У адным інстытуце", "Данута", "След на зямлі: скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны", "Вершалінскі рай", "Мая Джамалунгма", раман "Карані", "Развітанне з ілюзіямі" і іншыя. Стыль яго твораў вызначаецца шчырым і бескампрамісным рэалізмам, балансуе на мяжы дакументалістыкі і мемуарыстыкі. Менавіта асабістыя перажыванні і ўспрыняцце жыцця сталі асновай яго пісьма.

– *Тата заўсёды гаварыў і пісаў праўду. Перачытваючы яго творы, я бачу, наколькі дакладна ён перадаў усе этапы свайго жыцця. Гэта нават мне дапамагае ў нейкай ступені ўзнавіць у памяці некаторыя моманты,* – пачынае размову Валянціна Карпюк, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук, загадчык кафедры псіхіятрыі і наркалогіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

### Пасляваеннае студэнцтва

Першую аповесць "У адным інстытуце", якая выйшла ў 1953 годзе, гродзенскі пісьменнік прысвяціў сваёй альма-матэр. Апавед аўтара, быццам кадры, выхапленыя фотааб'ектывам, адкрываюць дынаміку аднаўлення пасляваеннага інстытуцкага жыцця: разбітыя вокны, пазабіваныя фанерай, лаўкі з грубых, неабстуганых дошак, на якія трэба было садзіцца і ўставаць аднačасова ўсім, бо яны перавароčваліся...

А колькі радасці было, калі адчынілі студэнцкую сталоўку! Абед зварылі з прадуктаў падсобнай гаспадаркі, а ў ролі афіцыянтак выступалі студэнткі, апранутыя ў форменныя кофтачкі і спаднічкі з ружовага шоўку, пазычаныя ў мясцовым рэстаране. З цеплынёй аўтар апісвае жыццё ў студэнцкім інтэрнаце на вуліцы Замкавай: ***"...за шклом двайных рамаў мерзлі загорнутыя ў газеты брусочкі сала, у скрынях ляжалі скруткі бялізны, з любоўю папрасаваныя матулямі..."*** З досціпам расказвае і пра практыку студэнтаў: ***"Восенню студэнтаў другіх курсаў усіх факультэтаў пасылалі на прадпрыемствы горада, у калгасы. Пасля працы яны павінны былі праводзіць там гутаркі, выхаваўчыя мерапрыемствы. Па выніках практыкі праходзіла канферэнцыя, дзе студэнты размаўлялі аб тым, што набалела. Скардзіліся, чаму ў палітэхнічных ВНУ будаваць масты студэнтаў вучаць шэсць гадоў, а настаўніка выпускаюць пасля чатырох. Чаму на літфаку чытаюць філасофію, а на фізмаце яе няма..."***

Многія студэнты прыйшлі вучыцца ў інстытут у адзенні, у якім вярнуліся з вайны. Часам у аўдыторыі нельга было зняць паліто, бо касцюм ці сукенка не такія, каб у іх выходзіць у людзі. Нягледзячы на гэта, усе студэнты жылі адзіным жаданнем – вучыцца!..



**Аляксей Карпюк (першы справа) разам са сваёй сям'ёй**

Вялікае жаданне вучыцца прысутнічала і ў былога артылерыста Берлінска-Ідрыцкай дывізіі першага беларускага фронта, удзельніка баёў за рэйхстаг Аляксея Карпюка. За дзесяць дзён да канца вайны ён атрымаў сур'ёзнае раненне і Вялікую Перамогу сустрэў у ваенным шпіталі ў Познані.

– *Усе гады вучобы ў інстытуце тата насіў асколак у лёгкім. Паглядзіце, які ён худы,* – звяртае ўвагу Валянціна, паказваючы на старыя студэнцкія фотаздымкі, – *хаця бацькі вельмі клапаціліся, малако перадавалі, вядома ж, гэтага не хапала… Любое фізічнае дзеянне тады адгукалася болем і крывацёкам: на спіне не загойваўся свішч.*

Пра сябе, пасляваеннага студэнта, Аляксей Нічыпаравіч піша і ў апошняй аўтабіяграфічнай аповесці "Развітанне з ілюзіямі": ***"Я, цяжка паранены і недалечаны, знайшоў сабе ў той час ціхі закутак – вучобу на факультэце англійскай мовы Гарадзенскага педінстытута… "***

Нягледзячы на дрэнны стан здароўя – меў дакумент інваліда Вялікай Айчыннай вайны II групы (хутка ад інваліднасці адмовіўся, малады хлопец не хацеў быць інвалідам), – Аляксей старанна вучыўся, быў старшынёй студэнцкага прафкама і нават удзельнічаў у гуртках бокса, валейбола і шахмат. Бегаў на дыстанцыі, трымаў гарадское першынство па стральбе.

Гродзенскі педінстытут стаў месцам знаёмства Аляксея з жонкай – Інай Цыгельніцкай, студэнткай літфака, якая ў будучым стала настаўніцай рускай мовы і літаратуры, працавала дырэктарам вячэрняй школы, а пасля абароны кандыдацкай дысертацыі прысвяціла 30 гадоў працы на кафедры педагогікі. Паводле ўспамінаў Валянціны, мама закахалася ў тату, калі на Нёмане ўбачыла на яго спіне вялікі рубец. Менавіта тады ён стаў для яе сапраўдным героем.

Пазней, пасля заканчэння вучобы, Аляксею зробяць аперацыю ў Маскве, у навукова-даследчым інстытуце Скліфасоўскага, і нарэшце дастануць надакучлівае смяротнае "джала" вайны.

ГІСТОРЫЮ ЎНІВЕРСІТЭТА - ПІШАМ РАЗАМ!

## Пошукі сябе

У 1949 годзе Аляксей Карпюк скончыў інстытут і быў накіраваны на працу загадчыкам Сапоцкінскага раённага аддзела адукацыі, затым уладкаваўся дырэктарам Біскупцоўскай сярэдняй школы Ваўкавыскага раёна, пасля выкладаў на кафедры педагогікі Гродзенскага настытута, быў літаратурным супрацоўнікам "Гродзенскай праўды", уласным карэспандэнтам газеты "Літаратура і мастацтва", загадчыкам агенцтва "Інтурыст", сакратаром абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР, упаўнаважаным усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах па Гродзенскай вобласці, дырэктарам музея гісторыі рэлігіі і атэізма.

*– Тата вельмі доўга і старанна шукаў сябе, спрабаваў развівацца ў розных напрамках. Яму заўсёды хацелася актыўнай дзейнасці, каб рабочы працэс праходзіў жыва, творча і цікава,* – падкрэсліла Валянціна Аляксееўна. – *Напрыклад, нас, дзяцей, ён ніколі не прымушаў вучыцца, і тым не менш мы старанна вучыліся: ён умеў зацікавіць. Памятаю, як тата мяне і іншых дзяцей з нашага двара вёз у лесапарк "Пышкі", дзе мы бегалі, крычалі, гулялі ў партызанаў. А ў гэты час ён ярка, вобразна расказваў нам пра ваенныя дзеянні. Мы з такім захапленнем слухалі!*



Паводле ўспамінаў дачкі, Аляксей Карпюк шмат чытаў, прычым на розных мовах: рускай і беларускай, англійскай, нямецкай, польскай. У кожным пакоі іх кватэры стаялі па 3-4 кніжныя шафы. Штомесяц на хатні адрас прыходзіла прыблізна 30 газет і часопісаў. Інтарэс да пастаяннага развіцця, вывучэння замежных моў, чытання ён прывіваў і дзецям:

*– Калі мне было 12 гадоў, тата купіў кнігу Генрыка Сянкевіча "У пустыні і пушчы" на польскай мове. Растлумачыў, як вымаўляюцца незнаёмыя літары, і адправіў самастойна чытаць. Так як кніга была надрукавана вялікім шрыфтам, мела захапляльны сюжэт і прыгожыя ілюстрацыі, я села і не змагла адарвацца, пакуль ўсю яе не прачытала. Так я вучыла польскую мову.*

Сапраўднае шчасце Аляксей Карпюк спазнаў, калі пачаў займацца пісьменніцкай дзейнасцю. У сваёй аповесці "Мая Джамалунгма" ён піша: ***"На працягу свайго жыцця я перабраў шмат прафесій, і з усіх найбольшае задавальненне мне дае пісанне. Яно мяне захапіла цалкам. Пісанне стала маім лёсам, я знайшоў спосаб, як быць найбольш карысным людзям. Я спазнаў шчасце, я ведаю, як мне жыць!"***

Аляксей Нічыпаравіч для сваіх дзяцей, якіх у яго трое, стаў сапраўдным узорам для пераймання, маральным арыенцірам і носьбітам самых лепшых каштоўнасцяў:

*– Апошняе слова ў нашай сям'і заўсёды было за татам. Ён ніколі не павышаў голас, не гаварыў, як рабіць, а як не рабіць, не падманваў і не маніпуляваў, аднак яго маўклівая рэакцыя на якое-небудзь дзеянне дакладна сведчыла аб тым, што так паводзіць сябе нельга.*

Нягледзячы на тое, што пісьменнік вёў актыўны лад жыцця, шмат часу праводзіў па-за домам, быў захоплены літаратурнай дзейнасцю, ён знаходзіў час на выхаванне дзяцей.

*– Памятаю адзін з зімовых вечароў, калі тата прыехаў з камандзіроўкі і прапанаваў мяне пакатаць на санках з горкі. Як толькі мы выйшлі, ён дастаў з кішэні шакаладку і чырвоную стужку і сказаў, што мне, цёмнавалосай, вельмі будзе пасаваць чырвоны колер. Тата – заняты і сур'ёзны чалавек, а думаў пра такія дробязі! Ён быў уважлівы да кожнага, клапаціўся не толькі пра сваю сям'ю, але і пра людзей, якія былі побач, лічыў сябе адказным за лёс гродзенскіх майстроў слова з Саюза пісьменнікаў. Нягледзячы на знешнюю суровасць, гэта быў вельмі чулы чалавек,* – дзеліцца ўспамінамі Валянціна.

Аляксей Карпюк вельмі любіў сваю родную зямлю. Гэта была свядомая пазіцыя, якая сфарміравалася пад уплывам яго бацькоў. Яны лічылі, што чалавек павінен жыць і працаваць на сваёй зямлі – на Гродзеншчыне. Таму ў дзяцей ніколі не было нават думкі з'язджаць з яе.

Субяседніца ўспамінае, як бацька заўсёды вучыў заставацца самім сабой, шанаваць мову, культуру і гісторыю свайго народа, не крывіць душой – называць рэчы сваімі імёнамі і не быць абыякавым да навакольнай рэчаіснасці. Ён актыўна змагаўся за цвярозы і разумны лад жыцця:

*– Ведаеце, у дзяцінстве ды юнацтве, калі тата быў побач, працаваў над кнігамі, я расла і не задумвалася аб тым, якога маштабу гэта чалавек, які неабсяжны яго талент. Толькі ў дарослым узросце пачынаеш адчуваць нейкую адказнасць перад грамадствам, разумееш, што сваімі паводзінамі ты не можаш тату падвесці.*

У сваім апошнім творы "Развітанне з ілюзіямі" Аляксей Карпюк, робячы агляд усяго жыццёвага шляху, яшчэ раз успамінае маладосць, студэнцкія гады і Гродзенскі педінстытут, час вучобы ў якім для яго назаўсёды застаўся як самы светлы, самы радасны ў жыцці.

**Таццяна СУШКО.**
**Фота з асабістага архіва**

Аляксей Карпюк узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І і ІІ ступені, залатым крыжам польскага ордэна "Віртуці Мілітары", медалямі "Партызан Айчыннай вайны І ступені", "За вызваленне Варшавы", "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне", "За ўзяцце Берліна" і іншыя. Заслужаны работнік культуры БССР (1980). Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1986)



**Выпуск студэнтаў аддзялення замежных моў, 1948 год.**
**Аляксей Карпюк - першы справа ў трэцім радзе**

# Вначале были слово и цифра:

История Купаловского университета начинается в 1940-м году, когда в Гродно был создан Гродненский учительский институт. Первыми его учебными подразделениями были отделения белорусского языка и литературы, русского языка и литературы, а также физико-математическое. Перед первыми преподавателями стояла сложная задача – обеспечить достойный уровень знаний обучаемых, подготовить специалистов для работы в школе в любой точке Советского Союза.

## 80-летние традиции филологического образования

После освобождения Гродно уже в педагогическом институте открылась кафедра русского языка и литературы. 14 декабря 1944 года, согласно сохранившемуся протоколу, состоялось первое заседание, на котором присутствовали заведующий кафедрой М.Л. Рей, доцент Н.С. Гурло, завсектором заочного обучения института А.Г. Высоцкая. За долгие годы существования кафедру, как и факультет, преобразовывали, делили, объединяли, но люди, работавшие здесь, всегда были преданы делу, формировали традиции учебного заведения.

Большинство сотрудников кафедры тогда не имели учёных степеней и званий, но они прошли суровую школу жизни в годы Великой Отечественной войны. Защищали Родину с оружием в руках В.А. Вавилов, С.А. Григорьев, В.П. Козлов, Л.А. Линёв, Н.А. Мельников, работали в тылу Е.В. Осокина, Н.А. Никитин. Среди студентов также было много фронтовиков.

Многое из того, что сегодня считается инновациями, было заложено ещё в 50-70-е годы. Поддерживалась связь со школой: организовывались чтения, проводились олимпиады, студенты вели кружки в детском доме, занятия в летних лагерях. На базе кафедр русского языка и русской литературы были открыты первые курсы по подготовке абитуриентов к поступлению в вуз. Филологи одними из первых начали разработку учебно-методических комплексов, электронных учебников и учебных компьютерных программ по лингвистическим дисциплинам, наладили сотрудничество с зарубежными коллегами.

Так, М.А. Корчиц совместно с венгерскими языковедами издал ряд словарей для зарубежных школ и в начале 90-х разработал обучающую программу-тренинг для занятий студентов в компьютерном классе. Студенческая «мама Лиза», впоследствии декан факультета Е.И. Лавринайтис несколько лет проработала консультантом при Министерстве народного образования Монгольской Народной Республики. Преподаватель кафедры русского языка П.И. Ковалевский стал одним из авторов «Свода важнейших правил русского правописания» и «Словаря русского языка», изданных под эгидой АН СССР.

Начиная с 60-х годов, задолго до появления программы «Приглашённый профессор», в Гродненский пединститут приезжали читать лекции выдающиеся лингвисты Т.П. Ломтев, А.Н. Тихонов, позже – М.В. Всеволодова, В. В. Дубичинский, А. А. Лукашанец, В.А. Карпов, С.М. Прохорова, литературоведы Ю.Б. Орлицкий, И.П. Фоменко, В.А. Скобелев, Н.Л. Вершинина, И.И. Плеханова, В.И. Тюпа и многие другие.

Новые перспективы открылись после преобразования в 1977 году педагогического института в университет. Была открыта кафедра общего и славянского языкознания (1980), которую возглавил известный не только на советском пространстве, но и за рубежом учёный, автор оригинальной концепции деривационной грамматики профессор В.М. Никитевич; в середине 90-х гг. по инициативе Л.В. Рычковой была образована кафедра классической филологии. Теперь на факультете готовили специалистов не только по русской и белорусской филологии, но и по классической филологии, компьютерному обеспечению, русскому языку как иностранному, редакционно-издательской деятельности, риторике.

